## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДА ТЭМ

### ТЭМА 1.
### Прадмет і задачы вучэбнай дысцыпліны, яе месца ў сістэме сацыяльна-гуманітарных навук

1. Чым адрозніваюцца паняцці «*мова*» і «*маўленне*»?
2. Якія функцыі выконвае мова ў грамадстве?
3. Дайце азначэнне паняццю «*нацыянальная мова*».
4. Што такое *літаратурная мова* і чым яна адрозніваецца ад *дыялектнай*?
5. Што такое *моўная норма*? Якія нормы характэрныя для вуснай формы літаратурнай мовы, а якія – для пісьмовай?
6. У якіх формах існуе беларуская літаратурная мова? Назавіце іх спецыфіку і сферу ўжывання.

### ТЭМА 2.
### Беларуская мова як адзін з базавых элементаў нацыянальнай культуры беларусаў

1. Патлумачце, чаму мова з'яўляецца формай нацыянальнай культуры. У якіх моўных сродках найярчэй адлюстроўваецца адметнасць этнасу?
2. Як вы разумееце выказванне «Мова – душа народа»?

### ТЭМА 3.
### Лексікалогія як раздзел мовазнаўства

1. Адкажыце, адназначным ці мнагазначным з'яўляецца слова *лексіка*.
2. Якія словы называюцца *сінонімамі, паронімамі, антонімамі, амонімамі*?

### Тэма 4.
### Лексіка беларускай мовы паводле паходжання і сферы ўжывання

1. Як вы разумееце тэрміны *індаеўрапейская мова-аснова, праславянская* (*агульнаславянская*) *мова, стараславянская мова, царкоўнаславянская мова, агульнаўсходнеславянская мова*?
2. Якія этапы перадгісторыі беларускай мовы звязаны з наступнымі датамі: а) канец III – пачатак II тысячагоддзя да н. э., б) VI–VII стст. н. э., в) IX–XIII стст.?
3. З якімі славутымі імёнамі нашых суайчыннікаў звязана станаўленне культуры, літаратуры і мовы ў XIV–XVI стст.?
4. Назавіце асноўныя помнікі старабеларускага пісьменства.
5. Укажыце прычыны заняпаду старабеларускай мовы.
6. З імёнамі якіх пісьменнікаў і паэтаў, грамадскіх дзеячаў і навукоўцаў звязана адраджэнне і станаўленне беларускай нацыянальнай мовы ў XIX–XX стст.?
7. З якога часу ў беларускай мове захоўваюцца словы: а) агульнаіндаеўрапейскія, б) праславянскія, в) агульнаўсходнеславянскія, г) спрадвечна беларускія?
8. Назавіце, з якіх моў запазычаны тэрміны *футбола, каратэ, парускага спорту*. Паразважайце, чаму тэрміны запазычаны менавіта з гэтых моў. З якіх моў запазычаны тэрміны вашага віду спорту?
9. Пералічыце асноўныя прыметы запазычаных слоў.

### ТЭМА 5.
### Паняцці «тэрмін», «тэрміналогія», «тэрміналагічная сістэма». Тэрміны фізічнай культуры і спорту.

1. Што абазначаюць паняцці «*тэрмін*» і «*тэрміналогія*»?

2. Як суадносяцца паняцці «*тэрміналогія*» і «*тэрміналагічная сістэма*»?

3. Якая розніца паміж агульнаўжывальным словам і тэрмінам? Назавіце адметныя асаблівасці тэрміна.

4. Назавіце асноўныя прычыны ўзнікнення варыянтных і сінанімічных тэрмінаў?

5. Якія тыпы тэрмінаў выдзяляюцца ў залежнасці ад будовы?

6. Назавіце асноўныя прыметы іншамоўных тэрмінаў.

7. Пералічыце спосабы ўтварэння тэрмінаў і растлумачце сутнасць названых спосабаў.

8. Вызначыце асноўныя этапы фарміравання беларускамоўнай спартыўнай тэрміналогіі. З якімі падзеямі звязана стварэнне тэрміналогіі фізічнай культуры і спорту?

9. Якія тэндэнцыі ўтварэння тэрмінаў фізічнай культуры і спорту існуюць у наш час?

## ТЭМА 6.
## Паняцце білінгвізму. Моўная інтэрферэнцыя і яе віды. Арфаэпічныя нормы беларускай літаратурнай мовы і прычыны іх парушэння.

1. Якімі словамі можна замяніць тэрміны *білінгвізм, полілінгвізм*?

2. Якія віды білінгвізму вылучаюць даследчыкі? Якія віды білінгвізму (полілінгвізму) характарызуюць вас як моўную асобу?

3. Дайце азначэнне паняццю *моўная інтэрферэнцыя*.

4. На якіх моўных узроўнях праяўляецца інтэрферэнцыя?

5. Назавіце адметныя рысы фанетычнай сістэмы беларускай мовы. Якія арфаэпічныя нормы абумоўлены гэтымі рысамі?

## ТЭМА 8.
## Прынцыпы і нормы беларускай арфаграфіі

1. Дайце азначэнне паняццю *арфаграфія*.
2. Якімі літарамі абазначаюцца галосныя гукі?
3. Якія графічныя асаблівасці беларускай мовы вы можаце назваць?
4. Якія асноўныя прынцыпы беларускай арфаграфіі вы ведаеце?
5. Якія напісанні грунтуюцца на *фанетычным*, а якія – на *марфалагічным* прынцыпе беларускага правапісу?
6. У чым сутнасць *традыцыйнага* і *дыферэнцыяльнага* напісанняў?
7. Якія правілы напісання *у* (у складовай) і *ў* (у нескладовай) вы ведаеце?
8. Як перадаюцца спалучэнні галосных у запазычаных словах?
9. Раскажыце пра напісанні слоў разам, праз злучок і асобна.
10. Раскажыце правілы выкарыстання вялікай літары на пісьме.
11. У чым адрозненне абрэвіятур і графічных скарачэнняў?

## ТЭМЫ 9–14.
## Назоўнік. Прыметнік. Лічэбнік. Дзеяслоў. Прыслоўе. Займеннік, прыназоўнік, часціца

1. Дайце азначэнне паняццю *марфалагічная норма*.
2. Якія самастойныя часціны мовы існуюць у беларускай мове?
3. Як вызначаецца род скланяльных і нескланяльных назоўнікаў?
4. На якія групы падзяляюцца назоўнікі ў залежнасці ад формы ліку?
5. Ад чаго залежаць канчаткі назоўнікаў 1, 2 і 3 скланення?
6. Як у беларускай мове скланяюцца прозвішчы?
7. Якія існуюць формы ступеней параўнання прыметнікаў? На што яны ўказваюць?
8. Акрэсліце спецыфіку скланення колькасных і парадкавых лічэбнікаў.
9. У чым спецыфіка ўжывання лічэбнікаў у беларускай мове?
10. Якія марфалагічныя нормы ўжывання займеннікаў вы можаце назваць?
11. Якія граматычныя катэгорыі ўласцівыя дзеяслову?

12. Якія формы мае дзеяслоў?
13. Як спосаб утварэння прыслоўяў уплывае на іх правапіс?
14. Якія службовыя часціны мовы існуюць у беларускай мове?

## ТЭМА 15.
## Сінтаксічныя асаблівасці беларускай літаратурнай мовы. Пунктуацыйныя нормы

1. Назавіце моўныя адзінкі, ужыванне якіх рэгламентуюць сінтаксічныя нормы.
2. Прывядзіце прыклады словазлучэнняў, у якіх выяўляецца нацыянальная спецыфіка беларускай мовы?
3. Сфармулюйце асноўныя правілы каардынацыі галоўных членаў сказа.
4. Якія нормы рэгулююць пастаноўку знакаў прыпынку ў пісьмовым тэксце?
5. Якія знакі прыпынку выкарыстоўваюцца ў пісьмовай мове? Якія функцыі выконваюць знакі прыпынку?
6. Якія знакі прыпынку могуць ставіцца ў канцы сказа?
7. Акрэсліце выпадкі, калі ў сказе ставіцца: а) працяжнік, б) двухкроп’е; в) дужкі; г) двукоссе.

## ТЭМА 16.
## Паняцце функцыянальнага стылю. Класіфікацыя функцыянальных стыляў

1. Дайце азначэнне паняццю *функцыянальны стыль*.
2. Назавіце функцыянальныя стылі сучаснай беларускай літаратурнай мовы, акрэсліце сферы іх ужывання.
3. Якія экстралінгвістычныя фактары ўлічваюцца пры класіфікацыі функцыянальных стыляў?
4. Пералічыце асноўныя функцыі кожнага са стыляў.
5. Што такое *падстыль*? Пералічыце падстылі навуковага, афіцыйна-справавога і публіцыстычнага стыляў.
6. Дайце азначэнне *навуковому стылю*. Чым абумоўліваюцца спецыфіка і стылёвыя рысы навуковага стылю? Пералічыце стылёвыя рысы, уласцівыя тэкстам навуковага стылю.
7. Якія лексічныя і фразеалагічныя моўныя асаблівасці характэрны для тэкстаў навуковага стылю?
8. Пералічыце асноўныя марфалагічныя моўныя асаблівасці навуковага стылю. Раскажыце пра стылістычныя магчымасці назоўніка, прыметніка, дзеяслова, дзеепрыметніка, дзеепрыслоўя і прыназоўніка.
9. Назавіце сінтаксічныя моўныя асаблівасці тэкстаў навуковага стылю.
10. Які стыль называецца *афіцыйна-справавым*? Ахарактарызуйце афіцыйна-справавы стыль: акрэсліце сферу яго выкарыстання, назавіце асноўныя стылеўтваральныя рысы, пералічыце падстылі і жанравыя разнавіднасці.
11. У чым праяўляецца стандартызацыя справавой дакументацыі?
12. Назавіце лексічныя моўныя асаблівасці тэкстаў афіцыйна-справавога стылю.
13. Якія марфалагічныя моўныя асаблівасці характэрны для тэкстаў афіцыйна-справавога стылю?
14. Пералічыце асноўныя сінтаксічныя асаблівасці афіцыйна-справавога стылю.
15. Дайце азначэнне *публіцыстычнаму стылю*. Ахарактарызуйце публіцыстычны стыль: назавіце сферу яго выкарыстання, асноўныя стылеўтваральныя рысы, пералічыце падстылі і жанравыя разнавіднасці.
16. Назавіце функцыі публіцыстычнага стылю.
17. Якія асноўныя лексічныя і фразеалагічныя асаблівасці публіцыстычнага стылю?
18. Назавіце марфалагічныя асаблівасці публіцыстычнага стылю.
19. Пералічыце асноўныя сінтаксічныя асаблівасці публіцыстычнага стылю.

## ТЭМА 17.

**Гісторыя фарміравання беларускай фізкультурнай і спартыўнай тэрміналогіі**

1. Па якіх прыметах слоўнікі падзяляюцца на энцыклапедычныя і лінгвістычныя?
2. У чым адметнасць тэрміналагічных слоўнікаў?
3. Якія тэрміналагічныя слоўнікі па фізічнай культуры і спорту вы ведаеце?